Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 СНЕЖНЯ 2016 г. СУБОТА № 249 (28359)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СПРАВЯДЛІВАСЦІ, ДУХОЎНАСЦІ І ЗГОДЫ!

**Віншаванне Прэзідэнта Беларусі з Раждаством Хрыстовым**

*Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раждаство Хрыстова 25 снежня*

**Дарагія суайчыннікі!**

Віншую вас з Раждаством Хрыстовым.

Гэта вялікае свята дорыць святло і радасць хрысціянам усяго свету, сімвалізуе набыццё чалавецтвам надзеі на лепшае, духоўна дасканалае жыццё. Сёння штодзённыя зямныя клопаты адступаюць на другі план і сэрца напаўняецца верай і любоўю.

Раждаство Хрыстова нязменна сведчыць нам аб перамозе міласэрнасці і дабрыні.

У гэтыя святочныя дні мы звяртаемся да вечных каштоўнасцей, якія пакладзены ў аснову хрысціянства, і праслаўляем высакародныя ідэалы гуманізму праз любоў да бліжняга, імкненне да міру, справядлівасці, духоўнасці і згоды.

Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Няхай спраўдзяцца ўсе чаканні і здзейсняцца самыя запаветныя мары.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БЕЛТА.

# КОЖНАМУ ДЗІЦЯЦІ — КЛОПАТ І ЛЮБОЎ

### Для ўсебаковага развіцця падрастаючага пакалення робіцца ўсё неабходнае

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на навагоднім дабрачынным свяце для дзяцей, якое прайшло ў Палацы Рэспублікі ў рамках акцыі «Нашы дзеці». На галоўную ёлку краіны былі запрошаны дзеці з усіх рэгіёнаў Беларусі ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.**

«У нас вялікая і слаўная гісторыя, багатая культура, прыгожая прырода. Але самае галоўнае — гэта шчырыя і працавітыя людзі. Многія пакаленні беларусаў упрыгожвалі нашу зямлю, бераглі яе і абаранялі. І нам з вамі трэба як мага далей зірнуць у будучыню нашай Беларусі. Менавіта ад вас залежыць, як будзе выглядаць наша зямля і якой стане краіна праз 20, 30 або 50 гадоў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў дзяцей цвёрда ісці да пастаўленай мэты, пераадольваючы перашкоды і цяжкасці, а таксама любіць сваю Радзіму, клапаціцца аб яе дабрабыце, шанаваць мір і бяспеку. «Вельмі хочацца, каб вы шчасліва і дружна жылі ў асяродзі родных і блізкіх людзей, з аптымізмам глядзелі ў будучыню і верылі ў лепшае. А калі ў кагосьці не атрымліваецца, вы павінны ведаць: у краіне шмат спагадлівых людзей, якія ніколі не пакінуць вас у бядзе», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы пра надыход доўгачаканых канікул і зімовых свят, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта асаблівы час, калі хочацца зрабіць нешта добрае, падарыць навакольным радасць і цудоўны настрой.

Прэзідэнт лічыць важным, каб асабліва ў гэтыя дні кожнае дзіця адчула любоў і клопат. На гэта якраз і нацэлена акцыя «Нашы дзеці». «Усё больш людзей з розных куткоў краіны імкнуцца ўнесці свой уклад у гэту важную і высакародную справу, каб свет вакол нас стаў лепшы, а шчаслівых усмешак было як мага больш. Калі гэтых усмешак не будзе, значыць, год пражылі дарма», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў перыяд навагодніх і калядных святаў асабліва клопатам і ўвагай трэба таксама акружыць і пажылых людзей, бо не ў кожнага з іх ёсць тыя, хто можа прыйсці і падарыць часцінку душы і ўвагі.

Прэзідэнт разам з запрошанымі на свята дзецьмі прысутнічаў на казачным навагоднім прадстаўленні «Хрустальная мелодыя», у якім дабро і справядлівасць перамагаюць зло. Пасля дзеці ўручылі Прэзідэнту сувеніры, зробленыя сваімі рукамі.

# УЗЫДЗЕ ЗОРКА ДАБРА І НАДЗЕІ

**Мінск. Маладая матуля Вольга БУТУРЛЯ прыйшла са сваёй дачкой Васілінай у перадсвяточны касцёл Сымона і Алены (Чырвоны касцёл).**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ДАЗВОЛЬЦЕ ЯМУ ПРЫЙСЦІ

**Пастырскае пасланне Мітрапаліта Тадэвуша КАНДРУСЕВІЧА на Божае Нараджэнне**

**«Хрыстус нарадзіўся, Бог аб'явіўся!»**

***Глыбокапаважаныя браты і сёстры, людзі добрай волі, суайчыннікі!***

Сардэчна вітаю вас усіх гэтым святочным воклічам і віншую з радасным і поўным духоўнага зместу святам Божага Нараджэння.

Евангелле прадстаўляе кранальную сцэну Божага Нараджэння. Марыя з Юзафам шукаюць месца, дзе мог бы нарадзіцца Збаўца свету. Яны стукаюць у дзверы розных дамоў і гатэляў, але іх нідзе не прымаюць. Сапраўды, як кажа св. апостал Ян, Езус прыйшоў да сваіх, але яны Яго не прынялі.

Гісторыя Бэтлеемскай ночы не завяршылася. Езус стукае ў дзверы нашых сэрцаў. Ён хоча быць з намі і адарыць нас сваім словам і збаўчай ласкай.

Ці дзверы нашых сэрцаў адчыненыя? Ці чакаем Езуса? Ці ахвотна Яго прымаем?

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!